## Міжраённы шашачны турнір «Ваш ход» сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

7 чэрвеня 2019 года спецыялістамі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна» быў арганізаваны II міжраённы турнір па шашках «Ваш ход» сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дадзенае мерапрыемства праходзіла ў ДУК «Раённы цэнтр культуры». У турніры ўдзельнічалі выхаванцы аддзяленняў дзённага знаходжання для інвалідаў 4 раёнаў (Астравецкі, Іўеўскі, Смаргонскі і Ашмянскі). Мэты і задачы: папулярызацыя шашачнага спорту сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі, выхаванне ў іх спакою і ўпэўненасці ў сваіх сілах, пачуцця патрыятызму і настойлівасці, уменне выйграваць і прайграваць з годнасцю, а таксама сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя ў сацыяльным асяроддзі.

Па выніках турніру месцы сярод раёнаў размеркаваліся наступным чынам: 1 месца - Ашмянскі, 2 месца - Іўеўскі, 3 месца - Смаргонскі.












Reebok










Reebok